ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1984

4

КАСТРЫЧНІКА
ЧАЦВЕР

№ 25 (1438)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

У РАМКАХ СУПРАЦОЎНІЦТВА

ў галіне навукі і культуры паміж БДУ імя У. І. Леніна і іншымі універсітэтамі краіны прадугледжаны сяброўскі абмен калектывамі мастацкай самадзейнасці. У гэтым годзе БДУ наведаў калектыў мастацкай самадзейнасці Адэскага універсітэта імя І. І. Мечнікава. З адказным візітам і з мэтай папулярызацыі беларускай народнай творчасці калектывы мастацкай самадзейнасці нашага універсітэта пабывалі нядаўна ў Адэскім дзяржаўным універсітэце. У паездцы прынялі ўдзел народны аркестр народных інструментаў, народная агітбрыгада і народны тэатр.

Калектывы мастацкай самадзейнасці далі вялікі канцэрт перад студэнтамі і выкладчыкамі Адэскага універсітэта, а таксама выступілі з праграмай у вёсцы Есіпаўка перад байцамі універсітэцкіх сельскагаспадарчых атрадаў.

Кіраўніцтвам Адэскага універсітэта была арганізавана для нашай дэлегацыі экскурсія дэса — горад-герой», удзельнікі паездкі наведалі заалагічны і мінералагічны музеі універсітэта, пазнаёміліся з некаторымі факультэтамі.

Напярэдадні ад'езду ў студэнцкім кафэ «Метраном» адбыўся вечар дружбы. На ім выступілі народны тэатр і народная агітбрыгада.

Візіт калектываў мастацкай самадзейнасці ў Адэскі дзяржаўны універсітэт імя І. І. Мечнікава пацвердзіў, што абмен такімі дэлегацыямі садзейнічае прапагандзе беларускай нацыянальнай культуры, павышэнню мастацкага ўзроўню калектываў.

У. МАКАРЭВІЧ,
дырэктар студэнцкага клуба.

37-Ю ГАДАВІНУ

незалежнасці адзначыў нядаўна індыйскі народ. 37 гадоў незалежнасці краіны — гэта складаныя гады барацьбы з эканамічнай адсталасцю. Вялікую дапамогу індыйскаму народу аказваў і аказвае Савецкі Саюз. Мы, індыйскія аспіранты і студэнты, удзячны лёсу, што такое вялікае для нас свята сустрэлі сярод савецкіх людзей — нашых даўніх і добрых сяброў.

САУМЕН НАХАР,
аспірант хімічнага факультэта.

● АГУЛЬНЫ СХОД ВЫКЛАДЧЫКАЎ ●

АРЫЕНЦІР НА ЗАЎТРА

ВОСЬ і падышоў да канца трэці працоўны семестр. Студэнцтва слаўна папрацавала. Яшчэ і цяпер успамінаюць у калгасах, на прадпрыемствах, аб'ектах юнакоў і дзяўчат з ганаровымі эмблемамі на грудзях. А зараз надышоў час, калі перад сваімі выхаванцамі гасцінна расчыняе дзверы шматлікіх аўдыторый, залаў, кабінетаў, бібліятэк універсітэт. Якім будзе новы навучальны год? Каб адказаць на гэта пытанне і сабраліся прафесарска-выкладчыцкі састаў і кіраўнікі універсітэта.

АДКРЫВАЮЧЫ СХОД, рэктар універсітэта Л. І. Кісялеўскі адзначыў, што калектыў БДУ імя У. І. Леніна ў мінулым 1983—1984 навучальным годзе ў цэлым дасягнуў станоўчых вынікаў: значна палепшыўся вучэбна-выхаваўчы працэс, павысілася якасць падрыхтоўкі спецыялістаў, на ўсіх факультэтах на аснове традыцыйных форм навучання развіваліся новыя, павялічылася сувязь грамадскіх дысцыплін з жыццём, пашырылася творчае супрацоўніцтва універсітэта з прадпрыемствамі.

Павышаная ўвага вучэбна-выхаваўчаму працэсу не магла не адбіцца на паспяховасці. Так, па выніках сесіі на першым курсе паспяховасць складае 87,1 працэнта, на другім — 88,2, на трэцім — 89,2, на чацвёртым — 94,2, на пятым — 99,5 працэнта. Радуюць адзнакі, атрыманыя ў час сесіі старшакурснікамі, і ў той жа час хвалююць, наводзяць на роздум вынікі сесій студэнтаў першых-трэціх курсаў. У чым прычына? Безумоўна, для вынікаў сесіі важна тое, як студэнт ставіцца да вывучаемага прадмета, як ён рыхтуецца да экзаменаў. У гэтай сувязі важную ролю іграюць экраны бягучай паспяховасці. На жаль, не на кожным факультэце могуць пахваліцца такімі экранамі. Не выключэнне і тое, што паспяховасць залежыць ад дысцыпліны. Па выніках праверак былі адзначаны выпадкі, калі на філалагічным факультэце на занятках адсутнічала 20—22 працэнты, на гістарычным — ад 4 да 9 працэнтаў навучэнцаў. Там, дзе выкладчыкі абыякава ставяцца да аўдыторыі, не звяртаючы ўвагі на яе колькасць, там, дзе чытаюцца лекцыі толькі таму, што іх патрэбна чытаць, і ствараюцца адпаведныя сітуацыі. Якасць ведаў студэнтаў у многім залежыць і ад якасці ведаў выкладчыкаў. Ад таго, як і ў якой форме чытаюцца лекцыі. А нярэдка на факультэтах можна сутыкнуцца і з такім: лекцыі чытаюць некваліфікаваныя выкладчыкі ў той час, як ёсць свабодныя, шмат гадоў прапрацаваўшыя педагогі. Але гэта зусім не значыць, што універсітэту не патрэбны маладыя спецыялісты. Наадварот, лічба 44 — сярэдні ўзрост прафесарска-выкладчыцкага саставу — насцярожвае, прымушае крытычна аднесціся ў першую чаргу да аспірантуры. У апошні час толькі 10—12 працэнтаў аспірантаў заканчваюць вучобу з абаронай дысертацыі.

Але вернемся да абітурыентаў. Для іх заахвочвання паступаць у ВНУ агітацыйнай прапаганды сёння мала, таму і праводзяцца гарадскія, абласныя алімпіяды, на факультэтах працуюць гурткі, створаны падрыхтоўчыя курсы. І ўсё ж папулярнасць такіх факультэтаў як фізічны, радыёфізікі і электронікі, прыкладной матэматыкі падае. Ёсць тут над чым падумаць кіраўнікам факультэтаў, партыйнай і камсамольскай арганізацыям.

Расце папулярнасць БДУ імя У. І. Леніна сярод замежных студэнтаў. У гэтым годзе 890 студэнтаў з 76 краін свету будуць набываць у нас веды. І радуе тое, што павысілася паспяховасць замежнікаў (90,4 працэнта).

Вучэбны працэс неразрыўна звязаны з навукова-даследчай работай. 66,9 працэнта студэнтаў займаюцца ў навуковых гуртках, выконваюць рознага роду навуковыя работы. Але ёсць і тут свае недахопы: фармальны падыход, замена самастойнай творчасці студэнтаў дробнай апекай выкладчыка.

Прыняцце рэформы школы аказала ўплыў на работу ўсяго калектыву універсітэта. Пытанне якаснай падрыхтоўкі спецыялістаў стала галоўным пры абмеркаванні даклада рэктара. Пакуль робяцца першыя крокі, падкрэслівалі выступаючыя, але і яны адчувальныя: вялікія змены адбыліся на кафедрах педагогікі, псіхалогіі; уносяцца карэктывы і дапаўненні ў вучэбныя планы факультэтаў; намечана правесці шэраг мерапрыемстваў ва універсітэце. Гэтым самым універсітэт павінен строга акрэсліць сваё своеасаблівае месца сярод іншых ВНУ, якія таксама рыхтуюць педагогаў.

Сход прайшоў ажыўлена. Пытанні разглядаліся сур'ёзна, па-дзелавому, былі адобраны слушныя пачынанні і справядліва ацэнена крытыка.

А. МАТУСЕВІЧ,
наш кар.

НА ЗДЫМКУ: з дакладам выступае рэктар Л. І. КІСЯЛЕЎСКІ.

Фота М. ДУБОВІКА.

● НАСУСТРАЧ 40-ГОДДЗЮ ПЕРАМОГІ ●

РАЯЦЦА ВЕТЭРАНЫ

Ветэраны... Яны прымаюць актыўны ўдзел у абаронка-масавай і ваенна-патрыятычнай рабоце, у інтэрнацыянальным выхаванні юнакоў і дзяўчат. Гэта і з'явілася асноўнай тэмай размовы на справаздачна-выбарным сходзе ветэранаў вайны БДУ імя У. І. Леніна. На ім выступілі Л. І. КІСЯЛЕЎСКІ — рэктар універсітэта, В. А. ГАЙСЁНАК — сакратар партыйнага бюро фізічнага факультэта, А. КАЗУЛІН — сакратар камітэта камсамола, А. М. РУХЛЯ — намеснік старшыні прафкома супрацоўнікаў, П. М. ХМЯЛЕЎСКІ — старшыня секцыі ветэранаў вайны СКТБ з ВВ, А. І. БАРДАНАЎ — Герой Савецкага Саюза, адказны сакратар Мінскай секцыі Савецкага камітэта ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Са змястоўным дакладам выступіў старшыня савета ветэранаў універсітэта І. В. МАРЧАНКА.

ВЯЛІКУЮ ўвагу савет ветэранаў, як і ўся ветэранская арганізацыя, удзяляюць выхаванню студэнцкай моладзі ў духу савецкага патрыятызму і сацыялістычнага інтэрнацыяналізму. Толькі за апошні час ветэраны вайны прачыталі звыш 1 500 лекцый і дакладаў, падрыхтавалі і правялі звыш 20 тэарэтычных канферэнцый і канферэнцый чытачоў. Асабліва плённа працаваў савет ветэранаў вайны, яго секцыі ў падраздзяленнях на гістарычным, механіка-матэматычным, фізічным, філалагічным, хімічным, юрыдычным факультэтах, факультэце радыёфізікі і электронікі, у НДІ ПФП, СКТБ з ВВ напярэдадні знамянальнага свята беларускага народа — 40-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Ветэранамі вайны праводзіліся гутаркі і дыспуты ў студэнцкіх інтэрнатах. Больш увагі стала ўдзяляцца рабоце з замежнымі студэнтамі. Актыўны ўдзел у лекцыйнай прапагандзе, у агітацыйнай рабоце прымалі Д. П. Жмуроўскі, М. Я. Зайцаў, К. І. Осіпаў, І. Д. Прахарэнка, Г. М. Трухноў, М. І. Юзефовіч. Ветэраны вайны актыўна выступалі па радыё, тэлебачанні, у перыядычным друку.

Студэнты пад кіраўніцтвам Д. П. Жмуроўскага і іншых вопытных педагогаў вядуць пошук невядомых герояў, збіраюць успаміны ветэранаў для «Летапісу народнай славы», паспяхова распрацоўваюць ваенна-патрыятычную тэматыку. Вялікі ўклад у справу ўвекавечання памяці студэнтаў-юрыстаў, што не вярнуліся з поля бою, унёс прафесар І. І. Гарэлік. Пры актыўным удзеле ветэранаў праведзена каля 50 паходаў па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа.

(Заканчэнне на 2-й стар.).

● НАСУСТРАЧ 40-ГОДДЗЮ ПЕРАМОГІ

РАЯЦЦА ВЕТЭРАНЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Праздзенне такіх акцый як «Вахта міру», «Я галасую за мір» і іншых мерапрыемстваў Маршу міру савецкай моладзі, Тыдня інтэрнацыянальнай салідарнасці студэнтаў, фестывалю палітычнай песні, мітынгаў, збору сродкаў у Фонд міру садзейнічала далейшаму ўзмацненню гераіка-патрыятычнага і інтэрнацыянальнага выхавання моладзі і студэнтаў. Самыя зацікаўленыя ўдзельнікі гэтых мерапрыемстваў — ветэраны.

Пры дапамозе ветэранаў актывізуецца дзейнасць спартыўных секцый універсітэта. З'явіліся новыя цікавыя формы арганізацыі работы сярод студэнтаў: правядзенне спаборніцтваў па кросу і кулявой стральбе на прызы Герояў Савецкага Саюза прафесара Д. П. Жмуроўскага і дацэнта М. Я. Зайцава, якія працуюць ва універсітэце.

Зараз рэктаратам, партыйным камітэтам універсітэта рыхтуецца да правядзення шэраг мерапрыемстваў па выкананню Пастановы ЦК КПСС «Аб 40-годдзі Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў». І самы галоўны абавязак усіх ветэранаў аказаць дапамогу і садзеянне кіраўніцтву універсітэта ў правядзенні гэтай работы.

Галоўнае — нястомна садзейнічаць павышэнню дысцыпліны, паляпшэнню вучэбнага працэсу, стварэнню атмасферы дзелавітасці і прынцыповасці сярод супрацоўнікаў. Важнейшым участкам дзейнасці ветэранаў як і раней з'яўляецца актыўны і шырокі ўдзел у ваенна-патрыятычным выхаванні моладзі. Разглядаючы гэта як неад'емную частку камуністычнага выхавання, як фактар павышэння абароназдольнасці Савецкай дзяржавы патрэбна шырокім фронтам весці прапаганду гераічных традыцый савецкага народа, Узброеных Сіл. Вельмі важна, каб пытанні гераіка-патрыятычнага выхавання больш шырока асвятляліся ў ходзе вучэбнага працэсу, асабліва пры вывучэнні грамадскіх дысцыплін, а таксама на занятках па ваеннай і медыцынскай падрыхтоўцы, грамадзянскай абароне. Патрэбна паўсядзённа фарміраваць у моладзі адказнасць за лёс сацыялістычнай Айчыны.

Неабходна настойліва ўкараняць у практыку работы секцый комплексны метад правядзення ваенна-патрыятычнай работы. Праводзіць яе цікава, з улікам запытаў і пажаданняў моладзі. Шырэй практыкаваць правядзенне ўрокаў мужнасці, прычым не толькі ў студэнцкіх групах, але і ў школах, піянерскіх лагерах. Патрэбна на матэрыялах самога жыцця фарміраваць у студэнтаў актыўную жыццёвую пазіцыю.

Зразумела, для гэтага належыць зрабіць нямала. Але хто, як не ветэраны, змогуць расказаць моладзі аб сваім цяжкім баявым юнацтве, падзяліцца вопытам, пераканаць маладых людзей у неабходнасці сумленна працаваць і вучыцца. Усё гэта не павінна заставацца ў запасе. Гэта патрэбна спаўна выкарыстаць у такой важнай справе, як выхаванне маладога пакалення.

З. АЛЯШКЕВІЧ,
наш кар.

● ПРАЦОЎНЫ МЕСЯЦ ВЕРАСЕНЬ ●

КОЖНЫ ДЗЕНЬ — УДАРНЫ

Хутка імчыць час. Здаецца, зусім нядаўна больш чым 750 студэнтаў нашага універсітэта — будучых гісторыкаў і філолагаў — прыступілі да работы на палетках Кругляншчыны. Прыехалі мы ў пачатку верасня.

БЫЛО ЦЁПЛА і сонечна, а зараз ужо часцей і часцей заўважаеш сумныя адмеціны на цудоўным абліччы сціплай, але непаказана прывабнай беларускай восені. Часцей і часцей шэрыя хмары зацягваюць блакітны небасхіл і льецца такі непатрэбны ў час уборкі бясконцы дождж, раніцай усё больш адчуваеш гаркаваты пах прэлага лісця. Калі пашанцуе, можна ўбачыць, як завіхаецца над маленькім балотцам непаўторная ў сваёй гарманічнай стройнасці нітка журавоў. І залатое лісце клёну, што павольна падае на зямлю, нібы адлічвае на нейкім казачным календары апошнія дні «бабінага лета». Так, не радуе нас наогул капрызнае восеньскае надвор'е. Асабліва адчуваеш гэта ў вёсцы: разбіваюцца дарогі, псуюцца, ламаюцца, становяцца магутнымі, але бездапаможнымі «вязнямі» на пераўвільготненых палетках бульбаўборачныя камбайны, трактары з бульбакапалкамі і юркія «шасікі»...

У гэтых умовах патрэбна не толькі асаблівая тэхніка (пра гэта дбаюць кіраўнікі гаспадарак), а і як мага больш працавітых і моцных рук, якія дапамогуць убраць выдатны ўраджай.

Тут як нельга дарэчы дапамога байцоў сельгасатрадаў — выхаванцаў БДУ імя У. І. Леніна, якія дыслацыраваны ў 11 гаспадарках Круглянскага раёна. Завітваем у адзін з іх. Атрад «Купалінка» першакурснікаў аддзялення беларускай мовы і літаратуры працуе ў калгасе «Свабода». Адразу адзначым, што «Купалінка» (а гэта 59 дзяўчат і 8 хлопцаў) адразу павяла ў сацыялістычным спаборніцтве, якое стала традыцыйным: ужо трэці год змагаюцца будучыя гісторыкі і філолагі за ганаровае права атрымаць Пераходны Чырвоны Сцяг раённага камітэта партыі.

Юнакі і дзяўчаты з «Свабоды» па-ударнаму, з добрым настроем працуюць, хаця часам і няма ў іх «вузкай спецыялізацыі». Даводзіцца выконваць самыя разнастайныя аперацыі: і лён падымаць са сцелішчаў, і бульбу збіраць за капалкай, сартыраваць яе, і нават сеяць азімыя. Нездарма ж у «раёнцы» з'явіўся матэрыял байца атрада Ігара Капылова «Усе работы добрыя». Так лічаць і яго аднакурснікі, якім хаця і не давялося яшчэ сядзець у адной аўдыторыі, але ў атрадзе яны паспыталі ежы з агульнага катла, спазналі каштоўнасць хлеба, глыбей зведалі жыццё сельскіх працаўнікоў, згуртаваліся ў адзіны калектыў аднадумцаў.

Вось толькі некалькі лічбаў, што адлюстроўваюць актыўную і плённую дзейнасць будучых філолагаў. Сабрана за бульбакапалкай больш за 360 тон клубняў, паднята льнотрасты з 50 га, адгружана ў дзяржаўны фонд збожжа 780 тон, пасеяна азімага жыта на плошчы звыш 70 га, высушана і дапрацавана 9 тон льносемя і некалькі тон семя шматгадовых бабовых траў, выкананы і шэраг іншых работ.

Нядрэнныя вынікі атрада і ў грамадска-палітычнай рабоце. Байцы «Купалінкі» далі 2 канцэрты перад мясцовымі жыхарамі, аказалі шэфскую дапамогу ветэранам вайны і працы, правялі некалькі вечароў з вучнямі Лыскаўшчынскай сярэдняй школы, аднавілі помнік воінам, якія загінулі ў час Вялікай Айчыннай вайны, адрамантавалі сталовую ў школе-інтэрнаце, дапамаглі аформіць два школьныя кабінеты...

Агульнае ўражанне: для студэнтаў кожны дзень — ударны.

Г. ЮРЧАНКА,
камісар Круглянскага занальнага штаба студэнцкіх сельскагаспадарчых атрадаў.

НА ЗДЫМКАХ: верасень стаў для студэнтаў-філолагаў добрым выпрабаваннем на працоўную сталасць — гэта і адлюстроўваюць здымкі.

Фота аўтара.

Цікавы эксперымент

АДЗІН з самых буйных і сучасных кінатэатраў сталіцы Беларусі — «Масква» — стаў удзельнікам незвычайнага Усесаюзнага эксперыменту. У адпаведнасці з рашэннем Дзяржкіно СССР у нашай краіне з кастрычніка бягучага года ў буйнейшых кінатэатрах шасці гарадоў — Мінска, Кіева, Ерэвана, Новасібірска, Новакузнецка і Горкага — будуць дэманстравацца найбольш значныя ў ідэйна-мастацкіх і відовішчных адносінах новыя фільмы да іх масавага выпуску на экраны.

Першым з 4 кастрычніка на экране кінатэатра «Масква» будзе дэманстравацца двухсерыйны мастацкі фільм «Жорсткі раманс», пастаўлены на кінастудыі «Масфільм» рэжысёрам Э. Разанавым па п'есе А. Астроўскага «Беспасажніца». Таксама ў праграму папярэдняга паказу ўключаны фільмы «Патрэбна салістка» (Рыжская кінастудыя), «Легенда пра каханне» (СССР — Індыя), «Мілы, дарагі, любімы, адзіны» («Ленфільм»), «Леў Талстой» (кінастудыя імя М. Горкага), «Вабанк» (Польшча). У час дэманстрацыі гэтых стужак у кінатэатры «Масква» адбудуцца сустрэчы гледачоў з удзельнікамі творчых груп — рэжысёрамі - пастаноўшчыкамі, акцёрамі і г. д.

Н. ГАРАШЭВІЧ,
метадыст кінатэатра «Масква».

Газета выступіла. Што зроблена?

У ГАЗЕЦЕ «Беларускі універсітэт» ад 5 красавіка 1984 года быў змешчаны артыкул В. Чарняўскага «Забіваюць Міку бакі». Факты, выкладзеныя ў матэрыяле, цалкам пацвердзіліся. Сапраўды, у аўдыторыях 37, 35, 27, 43, 41 нашага вучэбнага корпуса мэбля знаходзіцца ў дрэнным стане, шмат распісаных сталоў.

Рашэннем камітэта камсамола філалагічнага факультэта ад 10 красавіка гэтага года за кожнай аўдыторыяй факультэта замацавана акадэмічная група, якая пастаянна ў ёй займаецца. Студэнты адказваюць за парадак у аўдыторыі, у канцы кожнага тыдня праводзяць уборку памяшкання. Яны ж кантралююць стан сталоў, крэслаў і ў тыя дні, калі там займаюцца іншыя групы. Такая форма калектыўнага камсамольскага даручэння дазваляе пастаянна падтрымліваць парадак у аўдыторыях корпуса і не даць магчымасці жадаючым пакінуць свой «аўтограф» на стале, дошцы.

І. КРЭТОВІЧ,
сакратар камітэта камсамола філалагічнага факультэта.

● СЛОВА — ЛЕНІНСКАМУ СТЫПЕНДЫЯТУ

У ДОБРЫ ЧАС

ШМАТПАВЯРХОВЫ строгі будынак галоўнага корпуса БДУ імя У. І. Леніна... Добразычліва прымае ён у жніўні гаманлівыя ручайкі абітурыентаў. Шмат планаў, мар, надзей прыносяць сюды ў сваіх сэрцах дзяўчаты і хлопцы. Але не ўсім шчасціць стаць студэнтам нашага універсітэта. Заслужыць такое права — вялікі гонар, само званне студэнта БДУ імя У. І. Леніна акрыляе, надае сілы.

Я віншую вас, дарагія першакурснікі, з гэтым званнем, з пачаткам новай, прывабнай і адказнай пары вашага жыцця.

Ужо адцвілі летнія краскі, восень пафарбавала лістоту дрэў у казачна прыгожыя колеры, духмяна пахнуць познія антонаўкі, пусцеюць палі. Сярод тысяч тон сабранай бульбы ёсць і тоны, што прайшлі праз вашы рукі. Студэнцкае жыццё пачалося!.. Жадаю, каб на яго не лёг цень звыкласці, шэрай будзённасці, каб на ўсе гады вучобы вы захавалі прагу пазнання, каб навучанне ва універсітэце стала для вас часам настойлівай працы, пошукаў і адкрыццяў, моцнай студэнцкай дружбы.

Першы год вучобы складаны не толькі праграмай, але і таму, што студэнту-першакурсніку трэба прызвычаіцца да новай сістэмы навучання, якая ў многім разлічана на самастойную працу. Да таго ж ва універсітэце значна большы аб'ём матэрыялу, большыя патрабаванні. Учарашні школьнік прывык да таго, каб яго штодзённа правяралі настаўнікі, — ва універсітэце такога кантролю няма. Тут павінны быць найперш самакантроль, самадысцыпліна, усведамленне таго, што калі не будзеш рэгулярна займацца, імкненне атрымаць добрыя адзнакі разаб'ецца аб вялізныя рыфы незасвоенага матэрыялу.

Мне хочацца асабліва падкрэсліць, што з першага дня вучобы трэба настроіць сябе на тое, каб не прапускаць заняткаў. З пропускаў пачынаюцца не толькі прагалы ў ведах, але і гультайства, расхлябанасць, абыякавасць, якія неўзабаве нашчэнт знішчаць «душы высокія матывы».

Не ўяўляю студэнцкае жыццё без камсамольскай, грамадскай работы, без удзелу ў навуковых гуртках, без студэнцкіх вечароў, сустрэч з цікавымі людзьмі, без наведвання выставак, тэатраў, канцэртаў, без мастацкай самадзейнасці.

Жадаю вам, нашы першакурснікі, спаўна зведаць шчасце быць студэнтам БДУ імя У. І. Леніна, выкарыстаць тыя вялікія магчымасці ўсебаковай прафесійнай падрыхтоўкі, духоўнага ўзбагачэння, якія дае сваім выхаванцам наш універсітэт. У добры час!

В. КАЎХУТА,
студэнтка 5-га курса філалагічнага факультэта.

ЗНАЙСЦІ «СВАЙГО» СТУДЭНТА

● АКТУАЛЬНАЕ ІНТЭРВ'Ю

ПАЧАЎСЯ НАВУЧАЛЬНЫ ГОД. І хаця ў той ці іншай кампаніі першакурснікаў час ад часу яшчэ можна пачуць расказы з амаль фантастычнымі сюжэтамі, якія нязменна пачынаюцца прыкладна так: «А ў нас на сачыненні вось дык было...», усё ж новыя клопаты, новыя хваляванні, падзеі, безумоўна, засяроджваюць на сабе ўвагу тых, хто яшчэ ўчора пераступіў парог універсітэта. А разам з тым пара прыёмных экзаменаў яшчэ не паспела адысці так далёка, каб не выклікаць ужо ніякіх меркаванняў, абагульненняў, спрэчак... Яшчэ працуе над справаздачным дакладам прыёмная камісія, а на асабістых картках, што захоўваюцца ў дэканатах на кожнага студэнта, яшчэ, як гаворыцца, пасля запаўнення не паспелі прасохнуць чарнільныя запісы. Дэканаты таксама падводзяць вынікі ўступных экзаменаў.

Давайце паспрабуем пазнаёміцца з некаторымі з іх, завітаўшы на хімічны факультэт. Інтэрв'ю дае дэкан Вадзім Фёдаравіч ЦІКАВЫ.

— Вадзім Фёдаравіч, паспрабуем пачаць нашу размову з лічбаў, якія б характарызавалі і нашага «сяраднестатыстычнага» першакурсніка-хіміка ў гэтым годзе...

— Калі ласка. Агульная карціна наступная: на вытворчы паток (50 вакантных месц) было пададзена 122 заявы. У тым ліку заявы сюды падалі 32 медалісты. На педагагічным патоку (70 вакантных месц) 116 чалавек падавалі заявы, з іх 33 мелі «выдатныя» атэстаты.

— Гледзячы на гэтыя лічбы, можна сказаць, як змяніўся абітурыент-84 вашага факультэта ў параўнанні з абітурыентам мінулага года.

— Так, змены ёсць. Перш за ўсё трэба адзначыць педагагічны паток. Дзякуючы правядзенню школьнай рэформы, тут рэзка павялічыўся конкурс. Значна больш медалістаў вырашылі звязаць сваё жыццё з педагогікай.

— Разам з тым, напэўна, ёсць і іншыя тэндэнцыі...

— На жаль, гэта сапраўды так. Мяне клапоціць вось такі факт: на вытворчым патоку было атрымана толькі пяць заяў ад людзей, якія мелі пэўны стаж работы па спецыяльнасці. З іх выпрабаванне ведамі вытрымалі толькі двое. На педагагічны паток абітурыенты—работнікі вытворчасці — наогул не падавалі дакументаў. Сёння можна канстатаваць: сярод першакурснікаў з году ў год зніжаецца колькасць работнікаў вытворчасці са стажам работы больш за два гады. Гэта значыць, што прамысловыя прадпрыемствы не накіроўваюць маладых рабочых у ВНУ.

— А ці не настаў час, калі універсітэт, ды і факультэты павінны самі рыхтаваць для сябе папаўненне — безумоўна, разам са школай — яшчэ ў сярэдніх класах?..

— Прапанова не новая. Больш таго, прапанова, якая ўжо дзейнічае. У тым ліку і на нашым факультэце. Кожны год на базе хімфака праводзяцца гарадскія і абласныя алімпіяды па хіміі. Пры факультэце дзейнічае школа юных хімікаў. Усё гэта дае нам магчымасць выявіць сваіх патэнцыяльных студэнтаў. Можна назваць і імёны. Напрыклад, Ігар Васільеў з Віцебска, пераможца рэспубліканскай алімпіяды, Вольга Лук'янчык з Оршы таксама лаўрэат гэтых спаборніцтваў, Дзмітрый Жыткоўскі, мінчанін, актыўны слухач школы юных хімікаў — усё гэта людзі, якія не выпадкова прыйшлі на факультэт, з якімі мы пазнаёміліся ўжо даўно. Але праблема цалкам адліваецца вось у такое пытанне: «Як не толькі падрыхтаваць абітурыента, а як падрыхтаваць іменна «свайго» абітурыента?» Справа ў тым, што многія з нашых слухачоў пасля заканчэння школы хімікаў падаюць дакументы ў другія роднасныя інстытуты і на факультэты Маскоўскага, Ленінградскага, Кіеўскага універсітэтаў. Так што перад намі стаіць задача замацавання кадраў.

Інтэрв'ю правёў
В. ЧАРНЯЎСКІ,
наш кар.

Вас — 1 800. Вам выпаў гонар і абавязак. У верасні 1984 года вы пераступілі прыступкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Памятайце гэты дзень. Ён — кропка адліку. Жыццё пачынаецца спачатку. Памятайце, вы прыйшлі ў аўдыторыі, каб, набыўшы веды, стаць дастойнай зменай старэйшаму пакаленню краіны будаўнікоў камунізму.

У добры шлях, дарагія перашакурснікі!

«Мы — першакурснікі!» Фота В. Грамовіча.

● СА СКАРБОНКІ БЫВАЛЫХ: АМАЛЬ СУР'ЁЗНА

ЭРУДЫТАМ НА ЗАЎВАГУ

І ПРАФЕСАРЫ, і дацэнты, наогул выкладчыкі, любяць студэнтаў, якія добра разбіраюцца ў сусветных праблемах і падзеях. Гэта дакладна ўстаноўлена. Але вось няўдача: яны не пераносяць, калі набіраюцца эрудыцыі ў іх прысутнасці.

Непаразуменняў па гэтаму пытанню можна лёгка пазбегнуць, калі не браць з сабой на заняткі ні часопісаў, ні газет.

САМАЯ НАДЗЕЙНАЯ ШПАРГАЛКА

У СТУДЭНЦКІМ асяроддзі вядома мноства тыпаў самых разнастайных шпаргалак, пачынаючы ад прымітыўных «гармонікаў» і канчаючы дзівосамі самых апошніх дасягненняў радыё-, фота- і тэлетэхнікі. Але самымі бяспечнымі па-ранейшаму застаюцца шпаргалкі, якія вы пакінеце дома.

● УВАГА: ВУЧЫМ ЯК ВУЧЫЦЦА ●

«ПРАПАНУЮ МЕТАД...»

НАВІНКАМІ ЭКЗАМЕНАЦЫЙНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ ДЗЕЛІЦЦА ВЕЧНЫ СТУДЭНТ

Некалькі слоў для знаёмства. Я — Вечны Студэнт. Мноства стагоддзяў назад, паспяхова здаўшы ўступныя экзамены ў адну з вышэйшых навучальных устаноў, я прамаршыраваў пад першым у свеце плакатам: «Прывітанне новаму прыёму!» і з таго часу ўжо не пакідаю сцен ВНУ.

Я прайшоў праз такую колькасць калоквіумаў, гутарак, залікаў, заданняў і экзаменаў, што іх цяжка пералічыць нават на калькулятары. Калі раздаць студэнтам усёй краіны мае выдатныя адзнакі, то кожны атрымае права на дзве павышаныя стыпендыі. Калі паслядоўна звязаць усе мае «хвасты», то яны працягнуцца ад Оксфарда да БДУ і назад.

Безумоўна, «вечнасць» пэўным чынам уплывала на мяне. Я год ад году абагульняў, сістэматызаваў, удасканальваў свае веды і, што не менш важна, самі метады навучання. Некаторымі з сваіх сакрэтаў я б і хацеў сёння падзяліцца. Прапаную свой метад...

✦ ПАДРУЧНІК ДЛЯ АДНАГО

ЯКІМ БЫ кароткім ні быў курс запісаных лекцый, у час сесіі студэнт вымушаны яго скарачаць. Кожны пры скарачэнні ідзе сваім шляхам, і галоўнымі ў розных студэнтаў з'яўляюцца рэчы, часам не супадаючыя. Няма нічога страшнага. Бачыць прадмет па-свойму — права студэнта.

Сваё бачанне прадмета атрымліваецца ў тым выпадку, калі складаеш па асноўных пытаннях свайго роду планы-тэзісы. Гэта, па сутнасці, кароткія канспекты адказаў на пытанні па ўсяму курсу або храналагічныя табліцы з кароткім каментарыем.

✦ КАРТЫ, СХЕМЫ

НЕ АБАВЯЗКОВА па кожнаму прадмету, які неабходна здаваць, ведаць усё. Гэта практычна і немагчыма. Значна важнейшым з'яўляецца ўменне ўяўляць асноўную мадэль, схему, «шкілет» прадмета. Інакш кажучы, мець своеасаблівую карту прадмета, на якой было б пазначана, якая галіна ведаў да якой дапасуецца, што адкуль і чаму вынікае. Я перад экзаменамі нават малюю такія карты: то ў выглядзе дрэва ведаў, то як геаметрычную фігуру, а то часам нават узнікае сюжэтны «малюнак».

✦ ЭКЗАМЕН ПА СТАНІСЛАЎСКАМУ

НЕ ЗДЗІЎЛЯЙЦЕСЯ, на дапамогу студэнту прыходзіць яго тэорыя пераўвасаблення. Для сябе называю гэта «ролявы прынцып». Ён уключае перш за ўсё пройгрыш «пра сябе», у думках той ці іншай канкрэтнай сітуацыі. Напрыклад, стылістыку я вывучаю як бы ў ролі педагога, які рыхтуе заняткі на наступны дзень. Пры вывучэнні гісторыі, філасофіі імкнуся ўвайсці ў «вобраз» таго ці іншага філосафа, гісторыка, вяду палеміку ад яго імя. Асвойваючы сацыялогію, бачу сябе інтэрв'юерам у працоўным калектыве. Рыхтуючы курс якой-небудзь эканамічнай навукі, вельмі карысна на час адчуць сябе кіраўніком гаспадаркі... Словам, неабходна не пасіўнае завучванне, а ўяўленне, зацікаўленасць. Паспрабуйце, у гэтым сапраўды нешта ёсць.

✦ ШТО ТАКОЕ СТУДЭНЦКІ ТАЛЕНТ

КАМУ СА СТУДЭНТАЎ не вядома гэта пачуццё? Пачуццё страху перад экзаменамі. Вось як быццам бы і вучыў усё, і веды ёсць. А ўсё роўна страшна, увесь нацягнуты, як струна, думкі блытаюцца, зараз ісці да яго... да экзаменатара. Але, прабачце, чаму вы настройваеце сябе так, нібыта ідзяце на допыт? Паспрабуем разважаць. Экзаменатар — чалавек, для якога параграфы прадмета, які ты вывучаеш, гэта праблемы яго жыцця, работы. А калі паспрабаваць зірнуць на вучэбныя старонкі яго вачыма? Вачыма чалавека, які шукае аднадумцаў, апанентаў, цікавых пытанняў.

Калі вы і ёсць той самы зацікаўлены чалавек, адносіны да экзамена набываюць «інтымны» колер. Гэта ўжо не проста вучэбны матэрыял, а нешта бязмерна больш важнае, жывое. Іменна ў гэты момант экзамен са стандартнай працэдуры пераходзіць у другую якасць — у гутарку двух зацікаўленых людзей, якія думаюць аб адных праблемах. Як спецыялісты. І — страху як не бывала, наадварот, да вас прыйдзе пачуццё свабоды. Умець бачыць сябе ўжо спецыялістам, напэўна, галоўны талент студэнта.

Са слоў Вечнага Студэнта запісаў
Ч. ВІКТАРАЎ.

«ДРУЖБА-84»

ПРЫЗНАННЕ МАЙСТЭРСТВА

АПОШНІ МАТЧ на міжнародных спаборніцтвах «Дружба-84» савецкія баскетбалісткі праводзілі з камандай Балгарыі. Гульня нічога не рашала. Нашы спартсменкі ўжо забяспечылі сабе першае месца, а балгарскія — другое. Але на пляцоўку выйшлі стартавыя пяцёркі.

Стартавы састаў: ён пачынае гульню, ад яго залежыць, у якім рэчышчы яна пойдзе. Звычайна гульню пачынаюць самыя моцныя спартсменкі. У многіх выпадках на першых мінутах вырашаецца лёс матча. Так было і на баскетбольным турніры, што праходзіў летам у Маскве ў праграме спаборніцтваў «Дружба-84». Стартавы састаў зборнай СССР пераўзыходзіў усіх саперніка ў практычна рабіў перамогі камандзе. І калі дыктар аб'яўляў імёны баскетбалістак, што пачынаюць гульню, то ён нязменна называў прозвішчы Сямёнавай, Барэль, Мураўёвай, Савіцкай...

Галіна Савіцкая — студэнтка трэцяга курса факультэта журналістыкі. Спачатку яна закончыла Інстытут фізкультуры. Што прывяло яе ў гэтую ВНУ? Спорт. Так, без спорту Галіна сябе не ўяўляе. А што тады прывяло спартсменку на журфак? Некаторыя здзівяцца, калі пачуюць у адказ: спорт.

— Я люблю баскетбол,— гаворыць Савіцкая, — люблю тую барацьбу, тыя абставіны, якія бываюць у час гульні. І хачу, каб аматары спорту бачылі ўнутраны свет гульні спартсменаў. За сціплымі газетнымі радкамі гэтага не ўбачыш. А я хачу пераказаць.

Бачыць гульню. Гэта вызначае заслужанага майстра спорту СССР, трохразовую чэмпіёнку Еўропы, чэмпіёнку свету, бронзавага прызёра VIII летняй Спартакіяды народаў СССР, капітана «Гарызонта» Галіну Савіцкую.

— Галя — разумны ігрок, — характарызуе яе старшы трэнер «Гарызонта» С. Л. Халіпскі. — Яна не толькі гуляе ў нападзенні. Яна — дырыжор каманды. Ды і ў абароне Савіцкая гуляе вельмі добра. Але галоўнае — яна думае на пляцоўцы. Таму кожнае рашэнне баскетбалісткі — правільнае.

Савіцкая — сапраўдны баец. Калі выйшла на пляцоўку, змагаецца з усіх сіл. У матчы мінулага чэмпіяната СССР «Гарызонт» даганяў дынамавак Новасібірска. Здавалася, што перамогу атрымае «Гарызонт». Але раптам гульня разладзілася. Трэнеры ўзялі мінутны перапынак.

— Не магу болей, — сказала Галя.

— Тады прайграем матч, — закончыў С. Л. Халіпскі. Ён не папракнуў капітана. Яна зрабіла больш, чым магла. А без капітана каманда ўжо не магла выйграць.

Так, Савіцкая ўмее правільна разабрацца ў сабе. Яна ўмее добра настроіцца і павесці за сабой усю каманду. Але яна ведае, што не ўсё яшчэ атрымліваецца.

На многіх спаборніцтвах пабывала спартсменка. Але Савіцкая лічыць, што турнір «Дружба-84» галоўны ў яе жыцці. Не таму, што ён прынёс перамогу. Тут адбылося поўнае прызнанне майстэрства беларускай спартсменкі.

Матч зборных СССР — НРБ завяршыўся перамогай савецкай каманды. Вялікая заслуга ў гэтым стартавага саставу, у якім выступала Галіна Савіцкая. Дарэчы, гэта быў яе першы турнір, дзе яна ў саставе зборнай СССР у ліку першых выходзіла на пляцоўку.

● НА ЧЭМПІЯНАТАХ РЭСПУБЛІКІ І КРАІНЫ

ТРЭЦЯЕ ЎЗЫХОДЖАННЕ

ЭЛЬМІРУ ХАРАВЕЦ аматары шахмат рэспублікі добра ведаюць. Чатыры гады назад студэнтка першага курса факультэта журналістыкі кандыдат у майстры спорту паднесла свой першы сюрпрыз: стала пераможцай на чэмпіянаце рэспублікі. Потым яна паўтарыла поспех: стала майстрам спорту, удзельнічала ў фінале чэмпіяната краіны, у саставе каманды «Буравеснік» стала чэмпіёнкай краіны. 1983 год поспехаў не прынёс. Было адступленне назад і на рэспубліканскай арэне, і на усесаюзнай. Выступіла і ў фінале VIII летняй Спартакіяды народаў СССР, але сваіх магчымасцей не раскрыла.

Скептыкі пачалі гаварыць, што большага Харавец не дабʼецца. А што думала сама спартсменка? Яна зрабіла правільныя вывады. Шахматыстка выступала на многіх турнірах. Часу на падрыхтоўку да іх не хапала. Гэта і сказалася на майстэрстве, ды і вучыцца стала цяжэй. Давялося адмовіцца ад шэрагу спаборніцтваў і засесці за тэорыю шахматнай гульні. Галоўным экзаменам стаў чэмпіянат рэспублікі, на якім гульня студэнткі набыла новыя фарбы.

У Эльміры былі моцныя саперніцы. Мінулагодняя чэмпіёнка Т. Загорская, удзельніца чэмпіянату СССР-83 Р. Эйдэльсан, іншыя шахматысткі. Майстар спорту Т. Загорская адразу захапіла лідэрства. Але Харавец, атрымаўшы запар некалькі перамог, дагнала лідэра, а ў апошнім туры змагла абысці яе. А потым быў бліскучы старт у паўфінале чэмпіяната СССР. Пяць партый — пяць перамог. Пуцёўка ў вышэйшую лігу была забяспечана. Што скажа пяцікурсніца журфака ў фінале? Будзем чакаць добрай гульні.

● КАМАНДАР МАДЖЫДАЎ І ГАЛІНА САВІЦКАЯ — ПЕРШЫЯ ЗАСЛУЖАНЫЯ МАЙСТРЫ СПОРТУ СССР ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ

● ДВАЙНЫ ПОСПЕХ ЭЛЬМІРЫ ХАРАВЕЦ

● ЧАКАЛІ БОЛЬШАГА

Лета падарыла аматарам спорту шмат цікавых спаборніцтваў, у якіх удзельнічалі спартсмены універсітэта. Яны здавалі свае спартыўныя экзамены. Галоўнымі, бясспрэчна, сталі міжнародныя спаборніцтвы «Дружба-84», чэмпіянаты СССР і БССР, Усесаюзныя студэнцкія гульні.

ТОЛЬКІ Ў ВОСЬМЫМ ДЗЕСЯТКУ...

УСЕСАЮЗНЫЯ студэнцкія спартыўныя гульні праходзілі на працягу ўсяго лета. Многа спаборніцтваў прайшло ў Мінску. Беларуская зборная заняла агульнае чацвёртае месца.

Мы з нецярпеннем чакалі выступленняў спартсменаў нашага універсітэта. Чакалі... і расчараваліся. Вынік сумны —усяго толькі адзін удзельнік стаў прызёрам гульняў. Пяцікурснік ФПМ Аляксей Мядзведзеў у саставе зборнай рэспублікі заняў другое месца ў фехтаванні на шпагах. І агульнакамандны вынік сумны —Белдзяржуніверсітэт дзеліць 74—75 месцы. Перад намі не толькі інстытуты фізкультуры, народнай гаспадаркі, політэхнічны — нашы пастаянныя саперніки. Вышэй нас стаяць Гродзенскі медыцынскі інстытут, Гродзенскі і Гомельскі дзяржаўныя універсітэты, Магілёўскі педагагічны інстытут.

Не ўсе спартсмены універсітэта здолелі паказаць нават свае звычайныя вынікі. Трое веласіпедыстаў удзельнічалі ў групавых гонках, і ўсе трое — адзін юнак і дзве дзяўчыны — дружна не даехалі да фінішу. У пратаколах супраць іх прозвішчаў стаяць словы «сышоў».

Уладзімір Кошак у вольнай барацьбе ў сваёй катэгорыі быў адзінаццатым. У спаборніцтвах па класічнай барацьбе за прызавое месца змагаўся Вадзім Каржэнь, але ўдача адвярнулася ад яго — і ў выніку сёмае месца.

Тры спартсмены універсітэта выйшлі на стадыён у Кіеве разыграць узнагароды сярод лёгкаатлетаў. Праўда, Аляксандр Міхейкін і Тамара Міраноўская выступалі асабіста. Вынікі бегуноў уступалі іх лепшым рэзультатам. Толькі мнагаборка Вольга Сухамазава змагла пацвердзіць нарматыў кандыдата ў майстры спорту і даць заліковыя ачкі.

Чатыры разы прымала старт у басейне майстар спорту Эла Яўсюк. Але пасля спаборніцтваў яна павінна быць незадаволенай, як і фехтавальшчык Міхаіл Фабрыкент.

У зборную рэспублікі па мастацкай гімнастыцы ўваходзілі тры студэнткі універсітэта. Нельга сказаць, што выступілі яны ўдала. Але шостае месца ў групавых практыкаваннях стала поспехам.

Шостае агульнакамандное месца каманды тэнісістаў. Немалая заслуга ў гэтым Аляксандра Малашкевіча і Сяргея Ласа. Пятае месца ў спаборніцтвах цяжкаатлетаў заняў Валерый Шаўчук.

Вось і ўсё. Не вельмі густа у параўнанні з іншымі ВНУ. Ні разу універсітэт не называўся ў ліку ВНУ, прэтэндуючых на высокае месца ў асобных відах.

Можна гаварыць, што не ўсе вядучыя спартсмены змаглі прыняць удзел у спаборніцтвах, што Белсавет ДСТ «Буравеснік» не заўсёды правільна падыходзіў да фарміравання каманд. Але гэта не тлумачэнне. Мы прывыклі рыхтаваць спартсменаў сярэдняга ўзроўню. Нарматыў майстра спорту амаль для ўсіх становіцца пікам. А на большае не замахваемся. Ды і майстарскі рубеж у многіх спартсменаў і трэнераў не стаіць у планах. Чаму? Думаем, што на пытанне адкажуць кіраўнікі кафедры фізвыхаваня і спорту, спартыўнага клуба і трэнеры.

«ДРУЖБА-84»

СВЯТА ДЛЯ ДВАІХ

КАМАНДАР МАДЖЫДАЎ займаецца на другім курсе юрыдычнага факультэта. У чэрвені ён вытрымаў экзамены летняй сесіі і разам з трэнерам Віктарам Аляксандравічам Рудзянковым адправіўся на зборы каманды СССР па класічнай барацьбе.

...Напэўна, той ліпеньскі тыдзень запомніцца трэнеру надоўга. Па тэлебачанню трансліраваўся турнір па класічнай барацьбе ў праграме міжнародных спаборніцтваў «Дружба-84». У Будапешт з'ехаліся ўсе мацнейшыя барцы свету. Савецкім спартсменам супрацьстаялі вядомыя майстры з Балгарыі, Венгрыі, ГДР. Бясспрэчна, аматары спорту радаваліся перамогам барцоў нашай каманды. Але Віктара Аляксандравіча перш за ўсё цікавіў Камандар. Пакуль усё ішло добра. Чэмпіён Еўропы атрымліваў чыстыя перамогі.

І вось на экране — фінальны паядынак у вагавай катэгорыі да 62 кг. На дыване Ж. Вангелаў — чэмпіён Еўропы 1983 года, прадстаўнік Балгарыі, і К. Маджыдаў — чэмпіён Еўропы 1984 года.

Адразу ў атаку кідаецца Маджыдаў. Вангелаў памятае паражэнне ад яго на чэмпіянаце кантынента. Балгарын пераходзіць у абарону. Галоўнае выстаяць, падлавіць момант, калі сапернік раскрыецца, правесці контрпрыём. Першы перыяд — 0:0. Здавалася, што Камандар перастаў думаць на дыване, і яго хвалі атак хутка разабʼюцца аб граніт абароны саперніка. У другім перыядзе савецкі спартсмен спрабаваў прымяніць розныя прыёмы, але нічога не атрымлівалася. Вангелаў зразумеў, што пара пераходзіць і яму ў атаку. Імклівы рывок, і Маджыдаў трапіў у захват... Але Камандар здолеў вырвацца і сам перавёў саперніка ў партэр. 1:0. Адзін бал, адно ачко, мінімальная перавага прынесла поспех Маджыдаву. Фінальны свісток... Рукі Камандара падымаюцца ўверх і ён упершыню за турнір усміхнуўся. А потым падбег да трэнераў зборнай СССР І. Сапунова і І. Каршунова — шчыра дзякаваў ім.

У Мінск Камандар Маджыдаў прыехаў заслужаным майстрам спорту СССР. Такога звання ён дабіўся першым з універсітэцкіх спартсменаў. Потым Камандар з Віктарам Аляксандравічам доўга сядзелі ў інтэрнацкім пакоі і размаўлялі. Размаўлялі аб спаборніцтвах, аб будучых стартах, трэніроўках.

Так, новы сезон будзе для іх новым. На заслужанага майстра спорту цяпер будуць раўняцца. Ды і нямнога прайшло з таго часу, калі В. А. Рудзянкову Спорткамітэт БССР прысвоіў ганаровае званне заслужанага трэнера БССР.

— Планаў шмат, — гаворыць Віктар Аляксандравіч.— Але яны ўсе вядомыя. Будзем імкнуцца да перамог.

Старонку падрыхтаваў наш спецыяльны карэспандэнт У. АБРАМОВІЧ.

НА ЗДЫМКАХ: Г. САВІЦКАЯ, К. МАДЖЫДАЎ і В. А. РУДЗЯНКОЎ.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

4 кастрычніка 1984 г.

Зак. 1568. АТ 10437

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар

В. П. ВАРАБ'ЁЎ